## *Нашы спачуванні*



15 лютага пайшла з жыцця **Марыя Аркадзьеўна БЯСПАЛАЯ**, гісторык, заснавальніца навуковай школы ў галіне музеязнаўства «Тэорыя і практыка музейнай справы», патрыётка, прафесар кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, доктар гістарычных навук, прафесар.

Навукова-даследчы шлях Марыі Аркадзьеўны пачаўся ў БДУ; у 1971 г. скончыла гістарычны факультэт, а ў 1978 г. аспірантуру. У 1999 г. абараніла доктарскую дысертацыю па спецыяльнасці «айчынная гісторыя». У 2001 г. ёй прысвоенае вучонае званне «прафесар».

У БДУКіМ Марыя Аркадзьеўна працавала з 1979 г., з 2009 па 2020 г. з'яўлялася загадчыкам, а з 2020 г. – прафесарам кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства.

Яна надавала пільную ўвагу распрацоўцы і пастаяннаму ўдасканаленню лекцыйных курсаў, пашырэнню іх тэматыкі і прыстасаванню да спецыфікі ўніверсітэта. Па яе кнігах вучылася не адно пакаленне гісторыкаў, спецыялістаў у сферы музейнай дзейнасці.

М. Бяспалая актыўна займалася навуковай працай, зместам якой была не толькі гістарычная тэматыка, але і праблемы сацыякультурнай і музейнай дзейнасці, апублікавала 2 манаграфіі, вучэбны дапаможнік і больш за 150 артыкулаў у айчынных і замежных навуковых выданнях.

Яна з'яўлялася членам навукова-метадычных саветаў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, членам рэдкалегіі навукова-метадычных часопісаў «Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў» і «Вопросы музеологии» (Расійская Федэрацыя).

**ГА «Беларускі фонд культуры» і «Краязнаўчая газета» смуткуюць з прычыны смерці Марыі Аркадзьеўна БЯСПАЛАЙ і выказваюць словы спачування родным, блізкім і калегам спачылай.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ